многочисленных недостатков, в то же время их устранение было длительным и не всегда эффективным процессом.

## Библиографический список


1. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении законоположений 12 июля 1889 года о преобразовании крестьянских и судебных учреждений на губернии Витебскую, Минскую и Могилевскую : 12 июня 1900 г., № 18854 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. – СПб., 1900. – Т. 20. – С. 762–764.
2. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении законоположений 12 июля 1889 года на губернии Виленскую, Гродненскую и Ковенскую и об ассигнование необходимых на сие кредитов : 8 июня 1903 г., № 23106 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. – СПб., 1903. – Т. 23. – С. 687–689.
3. Высочайше утвержденное Положение о земских участковых начальниках : 12 июля 1889 г., № 6196 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. – СПб., 1891. – Т. 9. – С. 508–535.
4. Дело по жалобе землемера Новугрудского уезда Августовского на обвинение его земским начальником 7 участка Полозовым на медлительность действий при отграничении крестьянских земель от помещичьих. Выписки о количестве отграниченных надельных земель по 7 участку за 1904, 1905 гг. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 574.
5. Дело по ревизии делопроизводства земского начальника 2 участка Чаусского уезда Игнациуса произведенной непременным членом губернского присутствия старшим советником Тимофеевым // НИАБ. – Ф. 2014. Оп. 1. Д. 3045.
6. Дело по частной жалобе крестьянина Константина Адамовича на постановление земского начальника 5 уч. Минского уезда об оштрафовании его 3 рублями за расхаживание по камере во время разбора дел // НИАБ. – Ф. 252. Оп. 5. Д. 4.
7. Дело по частной жалобе Лейбы Каплана и Шепшеля Фишкина на постановление земского начальника 4 уч. на неправильно принятую меру за уклонение от суда // НИАБ. – Ф. 252. Оп. 5. Д. 7.
8. Журнал присутствия по обзору деятельности земских начальников и волостных правлений Чаусского, Чериковского, Мстиславского и др. уездов // НИАБ. – Ф. 2014. Оп. 1. Д. 3039.
9. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 333 с.


УДК 947.607.3 (043)

# ПРАЕКТЫ КІРАВАННЯ КАНФІСКАВАНЫМІ МАЁНТКАМІ Ў ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1830–1840-х гг.

**А. Д. Чэрнік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск,*
*chernikalla@mail.ru*

У артукуле разглядаюцца праекты кіравання канфіскаванымі маёнткамі ў Заходніх губернях у 1830–1840-х гг. Важную ролю ў правядзенні палітыкі ў заходніх, у тым ліку беларускіх губернях, адыгрываў Камітэт заходніх губерняў, які функцыянаваў у 1831–

1848 гг. У дадзенай рабоце разглядаюцца асноўныя праекты па кіраванню канфіскаванымі маёнткамі: планы, рэалізацыя праектаў і іх вынікі. Аўтар вызначае ролю Камітэта заходніх губерняў у выпрацоўцы і ажыццяўленні гэтых праектаў, у тым ліку абапіраючыся на такую крыніцу, як журналы Камітэта заходніх губерняў. Аўтар прыходзіць да высновы, што рэальных зменаў гэтыя праекты не прынеслі ў сістэму землеўпарадкавання.

***Ключавыя словы:*** Расійская імперыя; Заходні край; Камітэт заходніх губерняў; дзяржаўная вёска; канфіскацыя; арэнда; безсправаздачная адміністрацыя; маярат; Я. Ф. Канкрын; П. Д. Кісялёў; Д. Г. Бібікаў; А. В. Сямёнаў; Ф. Я. Мірковіч.

# ПРОЕКТЫ УПРАВЛЕНИЯ КОНФИСКОВАННЫМИ ИМЕНИЯМИ В ЗАПАДНЫХ ГУБЕРНИЯХ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В 1830–1840-х гг.

**А. Д. Черник**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, chernikalla@mail.ru*

В статье рассматриваются проекты управления конфискованными имениями в Западных губерниях в 1830–1840-х гг. Важную роль в проведении политики в западных, в том числе белорусских губерниях, играл Комитет западных губерний, функционировавший в 1831–1848 гг. В данной работе рассматриваются основные проекты по управлению конфискованными имениями: планы, реализация проектов и их результаты. Автор определяет роль Комитета западных губерний в выработке и осуществлении этих проектов, в том числе опираясь на такой источник, как журналы Комитета западных губерний. Автор приходит к выводу, что реальных изменений эти проекты не принесли в систему землеустройства.

***Ключевые слова:*** Российская империя; Западный край; Комитет западных губерний; государственная деревня; конфискация; аренда; безотчетная администрация; майорат; Е. Ф. Канкрин; П. Д. Киселев; Д. Г. Бибиков; А. В. Семенов; Ф. Я. Миркович.

# PROJECTS FOR THE MANAGEMENT OF CONFISCATED ESTATES IN THE WESTERN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE 1830–1840's

**A. D. Chernik**

*Belarusian State University, 4, Praspiekt Niezaliežnasci, Minsk, 220030, Belarus, chernikalla@mail.ru*

The article discusses projects for the management of confiscated estates in the Western provinces in the 1830's and 1840's. The Committee of Western Provinces, which functioned in 1831–1848, played an important role in conducting policy in Western, including Belarusian provinces. This paper discusses the main projects for the management of confiscated estates: plans, project implementation and their results. The author defines the role of the Committee of the Western Provinces in the development and implementation of these projects, including relying on such a source as the journals of the Committee of the Western Provinces. The author

comes to the conclusion that these projects did not bring any real changes to the land management system.

***Keywords:*** Russian Empire; Western Region; Committee of Western Provinces; state village; confiscation; rent; unaccountable administration; majorat; E. F. Kankrin; P. D. Kiselyov; D. G. Bibikov; A. V. Semenov; F. Ya. Mirkovich.

Наступствам паўстання 1830–1831 гг. стала канфіскацыя маёнткаў у паўстанцаў і перадача іх у казну. Частка канфіскаваных маёнткаў перадавалася ў Ваеннае міністэрства: «Усе канфіскаваныя маёнткі мяцежнікаў у Кіеўскай і Падольскай губернях перадаць цяпер жа, надалей да асаблівага загаду нашага, у вядзенне Ваеннага міністэрства» [3, с. 86]. Затым частка маёнткаў перадавалася ў Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. Камітэт спрабаваў вырашыць пытанне аб адносінах паміж сялянамі канфіскаваных маёнткаў і казёнымі арандатарамі. Адной з першых ідэй у Камітэце была раздача 250 рускім чыноўнікам зямлі невялікага памеру ў вотчыннае валоданне на асаблівых правах: «Аднаўленне і ўдасканаленне плана імператрыцы Кацярыны падараваннем маёнткаў рускім чыноўнікам, пераважна небагатым, за выдатныя іх заслугі невялікімі ўчасткамі ў вотчыннае валоданне на асаблівых правілах, якія папераджаюць раздрабленне маёнткаў і пераход іх з таго роду, якому яны падараваныя, прынясе карысць непараўнальна істотную і некалі можа скласці адзін з надзейных сродкаў да зліцця Заходніх губерняў ва ўсіх іх саслоўях з Расіяй» [2, с. 126]. Варта адзначыць, што імператар і Камітэт заходніх губерняў былі супраць арэнды казённых зямель, так як: «Падараванне маёнткаў у валоданне нашчадкавае будзе больш выгадна, чым усякая сістэма арэндная, пры якой маёнткі заўсёды больш-менш падвяргаюцца стратам, а сяляне прыгнёту, бо ўласнасць, не ўмацаваная ўладальніку на заўсёдны час, не засцерагаецца ім для яго нашчадкаў; часовыя ўладальнікі наогул клапоцяцца не столькі пра дабрабыт пасялян, колькі пра выманні па магчымасці самых вялікіх для сябе выгод да заканчэння тэрміну арэнднаму іх валоданню» [2, с. 126]. Была і яшчэ адна выгада: урад мог сам усталёўваць памер павіннасцяў сялян, не баючыся абурэння памешчыкаў. Велічыню павіннасцяў павінна была вызначыць люстрацыя. Камітэт склаў агульныя правілы для люстрацыі казённых маёнткаў, якія былі зацверджаны 18 лістапада 1831 г. Гэтыя правілы рассылаліся губернатарам Заходніх губерняў: «Даць міністру фінансаў разаслаць іх [правілы] сакрэтна да грамадзянскіх губернатараў Заходніх губерняў» [2, с. 170]. Канчатковы праект люстрацыі павінен быў прыняцца толькі пасля атрымання водгукаў ад мясцовых губернатараў. У выніку можна сказаць, што Камітэт вызначыў тое, што канфіскаваныя маёнткі будуць раздавацца з дакладным вызначэннем павіннасцяў сялян і абавязкаў памешчыкаў, з забаронай прадаваць сялян і падзяляць іх сем'і [4, с. 40].

На пасяджэнні Камітэта 4 мая 1832 г. стала зразумела, што планы па раздачы казённых маёнткаў рускім дваранам разбураныя. Жадаючых адправіцца ў Заходнія губерні амаль не было, а калі некаторыя і згаджаліся, то неўзабаве яны з'язджалі і пакідалі свае маёнткі мясцовым арандатарам: «Арэндныя ўладальнікі вельмі рэдка жывуць у падараваных ім маёнтках, давалі іх ад сябе ў кіраванне або ўтрыманне мясцовым абывацелям» [2, с. 203]. У выніку ў Заходніх губернях з'явілася субарэнда [1, т. 1, с. 435]. Рускі генералітэт і бюракратыя атрымлівалі ў арэнду падараванні і пераўступалі іх за пэўную суму мясцовым памешчыкам, якія з'яўляліся фактычнымі ўладальнікамі з фармальнага зацвярджэння Казённых палат пад выглядам кіраўнікоў і давераных [1, т. 1, с. 435].

10 мая 1832 г. Казённым палатам было прадастаўлена права аддаваць канфіскаваныя маёнткі па таргах ў арэнду добранадзейным людзям пры рэкамендацыі правадыра дваранства і пры зацвярджэнні губернатарам. Дадзеная мера была звязана з адсутнасцю жадаючых з вялікарускіх губерняў узяць у ўтрыманне казённыя маёнткі Заходніх губерняў. Міністр фінансаў у запісцы 23 лістапада 1832 г. прапаноўваў аддаваць у арэнду маёнткі з прыбыткам не больш за 1 000 руб. срэбрам у год на тэрмін ад 3 да 6 гадоў [2, с. 305]. Камітэт заходніх губерняў не пагадзіўся з гэтым праектам і адхіліў яго. Прычынай было названа наступнае: «Раздача гэтых [маёнткаў] у арэнду на кароткачасовыя тэрміны ад 3-х да 6-ці гадоў магла б толькі прывесці маёнткі гэтыя ў большы заняпад» [2, с. 305]. У выніку Камітэт 12 снежня 1832 г. пастанавіў: «Даць толькі казённым палатам клапаціцца пра ўладкаванне добранадзейнага ў азначаных маёнтках кіравання» [2, с. 305].

Мясцовыя ўлады спрабавалі прытрымлівацца ўрадавай палітыцы, таму імкнуліся аддаваць казённыя маёнткі ў арэнду праваслаўным і нават прадстаўнікам евангелічнага вызнання, але пры гэтым адмаўлялі каталікам. Але ў рэальнасці атрымлівалася іншая сітуацыя. Участкі атрымлівалі ў асноўным тыя, хто быў гатовы больш заплаціць. Паказальны выпадак адбыўся ў 1835 г. у маёнтку Спаса-Юрэвічы Віцебскай губерні. На арэнду гэтага маёнтка прэтэндавала два чалавекі – польскі памешчык Падзвінскі і купец Краніхфельд, які быў давераным барона М. А. Корфа і абяцаў падтрымліваць праваслаўе [4, с. 41]. Падзвінскі абяцаў плаціць арэндную плату ў 10 200 руб. у год, а Краніхфельд, на аснове ацэнкі стану маёнтка, быў гатовы плаціць толькі 8 500 руб. у год. У выніку маёнтак аддалі ў арэнду Падзвінскаму. Толькі ў некаторых маёнтках атрымоўвалася прызначаць праваслаўных арандатараў з дапамогай падтрымкі полацкага епіскапа Смарагда. Епіскап быў перакананы, што наяўнасць арандатараў-каталікоў, якія «адварочваюць сялян ад прыняцця праваслаўя», з'яўляецца

галоўнай прычынай недалучэння жыхароў канфіскаваных маёнткаў да праваслаўя [4, с. 41].

Арэндная сістэма працягвала выклікаць занепакоенасць у Камітэце заходніх губерняў. Напрыклад, міністр фінансаў Я. Ф. Канкрын у сваёй запісцы 16 верасня 1833 г. апісваў стан канфіскаваных маёнткаў такім чынам: «Маёнткі, кіраваныя камісарамі з тамтэйшых жыхароў-палякаў, у самы кароткі час прыведзены ў крайні заняпад: сяляне знаходзяцца ў вельмі нявыгадным становішчы, гаспадарчыя ўстановы прыйшлі ў заняпад, будынкі руйнуюцца, рухомасць або раскрадаецца, або падменьваецца рэчамі ніжэйшай якасці; самыя ж даходы бязмерна зменшаны, а некаторыя маёнткі нават зусім іх не прыносяць» [2, с. 447]. Прычынамі такога становішча міністр фінансаў лічыў тое, што маёнткі кіруюцца палякамі, некаторыя з якіх нават удзельнічалі ў паўстанні, а таксама ў неэфектыўным кіраванні з боку Казённых палат. 24 верасня 1837 г. Камітэт заходніх губерняў прапанаваў для ўдасканалення кіравання канфіскаваных маёнткаў падзяліць усе канфіскаваныя ўладанні на акругі і ўчасткі і ў кожны з іх прызначыць па адным камісару: «Падзяліць гэтыя [канфіскаваныя маёнткі] для зручнасці нагляду, згодна з прадстаўленным пры гэтым табелі, па колькасці душ на акругі і ўчасткі. У кожную акругу і ўчастак вызначыць, пад залежнасцю казённых палат, па аднаму камісару» [3, с. 214]. На ўтрыманне камісараў спатрэбілася б да 38 290 руб. у год. На 1837 г. у Беларусі налічвалася 243 канфіскаваных маёнткаў з 64 272 душамі сялян абодвух полаў [4, с. 153]. Але прапанаваны праект Камітэта не быў рэалізаваны з-за таго, што 26 снежня 1837 г. было створана Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў, якое і занялося ўладкаваннем дзяржаўнай вёскі.

28 снежня 1839 г. было выдадзена устанаўленне аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў Заходніх губернях. У ім меркавалася замяніць сістэму аддачы казённых маёнткаў у арэнду на аддачу ўладанняў у добранадзейную безсправаздачную адміністрацыю на 12 гадоў. Прадугледжвалася і магчымасць аддачы маёнткаў на большы тэрмін аднаму і таму ж арандатару, калі ён палепшыў стан аддадзенага яму маёнтка. Міністр дзяржаўных маёмасцяў П. Д. Кісялёў прасіў генерал-губернатараў Заходніх губерняў скласці спісы такіх добранадзейных арандатараў. Пажаданнем міністра было тое, каб гэтыя асобы былі адной веры з сялянамі і выдатна разбіраліся ў сельскай гаспадарцы. У Віцебскай і Магілёўскай губернях падборам кандыдатаў займаліся ваенна-павятовыя начальнікі. Таксама па сакрэтным загадзе П. Д. Кісялёва палаты дзяржаўных маёмасцяў і акруговыя ўпраўленні былі абавязаныя ахоўваць інтарэсы сялян і абараняць іх ад самавольства часовых уладальнікаў [4, с. 42].

Па прапанове Камітэта памешчыкам з цэнтральных губерняў, якія паспяхова кіравалі дзяржаўнымі маёнткамі ў Заходніх губернях на працягу

12 гадоў, гарантавалася замест 10 % прыбытку ад даходаў маёнтка 30 %. Таксама такім памешчыкам давалася права ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах. З-за змены сістэмы атрымання дзяржаўных уладанняў у часовае карыстанне прыйшлося складаць новыя «Правілы аб заснаванні ў казённых аблюстраваных маёнтках заходніх губерняў, якія застаюцца часова на гаспадарчым становішчы, безсправаздачнай у даходах адміністрацыі і формаў кантрактаў з адміністратарамі». Старая форма кантрактаў не заўсёды агароджвала сялян ад прыгнёту, а казну ад страт, але пры гэтым абмяжоўвала правы адміністратараў, што перашкаджала іх прыцягненню да кіравання маёнткамі. Гэтыя правілы абмяркоўваліся на пасяджэнні Камітэта заходніх губерняў 5 верасня 1844 г., а 26 верасня былі прыняты пасля адабрэння імператара як вопыт на 3 гады [4, с. 43]. Па ўказе 10 лютага 1847 г., пасля заканчэння тэрміну ў 3 гады, казённыя маёнткі аддаваліся ў 12-гадовае ўтрыманне на ранейшых умовах рускім і остзейскім дваранам пры ўмове пастаяннага пражывання і кіравання маёнткамі. Таксама маёнткі маглі без таргоў пры дазволе Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў аддавацца мясцовым ранейшым арандатарам на 6–12 гадоў пры паспяховым добраўпарадкаванні маёнткаў. Калі ж не было жадаючых, то можна было маёнткі набыць у часовае валоданне з публічных таргоў.

У многіх членаў Камітэта і ў мясцовых уладаў ідэя аб 12-гадовай безсправаздачнай адміністрацыі выклікала незадавальненне. Яны лічылі, што такая сістэма яшчэ больш шкодная ў палітычным сэнсе, чым арэнда. Напрыклад, кіеўскі генерал-губернатар Д. Г. Бібікаў не верыў, што можна прыцягнуць патрэбную колькасць рускіх памешчыкаў ў Заходнія губерні, таму ён рабіў выснову аб тым, што сяляне трапяць да палякаў-адміністратараў. У сваю чаргу, ён прапаноўваў стварыць сістэму маяратаў з аддачай іх толькі рускім дваранам. На пасяджэнні Камітэта 31 мая 1840 г. П. Д. Кісялёва папрасілі адказаць на прапанову Д. Г. Бібікава і стварыць некалькі маяратаў: «Утварыць хоць некалькі маяратаў, каб пакласці прынамсі пачатак гэтай важнай меры, якая, на думку Камітэта, ёсць адна з самых сапраўдных для распаўсюджвання ў Заходнім краі рускіх пачаткаў» [3, с. 506].

Міністру фінансаў Я. Ф. Канкрыну была даручана выпрацоўка агульных правілаў па аддачы казённых зямель у маяраты. У выніку ён прыйшоў да высновы, што перадача канфіскаваных маёнткаў у вотчыннае валоданне не вырашыць палітычных задач. Больш важным ён лічыў прывязаць сялян Заходніх губерняў да Расіі. З ім пагадзіўся і П. Д. Кісялёў. А дырэктар дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў Ф. Ф. Вігель лічыў, што лепш казённыя землі раздаць у вечнае нашчадкавае валоданне [4, с. 44].

П. Д. Кісялёвым быў прапанаваны праект стварання маяратаў з непадзеленых канфіскаваных, ленных, езуіцкіх маёнткаў і з маёнткаў, набытых у памешчыкаў. Камітэт ухваліў гэтую прапанову і 6 снежня

1842 г. Мікалай І зацвердзіў «Палажэнне аб маёнтках даравальных на праве маяратаў у губернях ад Польшчы вернутых».

Маёнткі пад маяраты пачалі падбіраць у маі 1840 г. Больш актыўна гэты працэс пайшоў пасля пасяджэння Камітэта заходніх губерняў 17 лістапада 1842 г. Да канца 1842 г. было падабрана 273 маёнткаў, але большасць з іх не маглі стаць маяратамі з-за іх беднасці. Да канца 1844 г. ва ўсіх Заходніх губернях было набыта каля 70 маёнткаў. Але 4 верасня 1844 г. імператар распарадзіўся прыпыніць куплю маёнткаў з-за таго, што грошы, якія былі для гэтага прызначаныя, пайшлі на адміністрацыйныя выдаткі Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. У выніку, у 1846 г. быў створаны толькі адзін буйны маярат: маёнтак Юрбург у Ковенскай губерні, які Мікалай І падараваў князю І. В. Васільчыкаву [4, с. 44].

У 1846 г. пытанне аб маяратах зноў абмяркоўвалася ў Камітэце заходніх губерняў. Перад гэтым была пададзена запіска ад мінскага губернатара А. В. Сямёнава ад 31 сакавіка 1846 г. У ёй ён прапаноўваў заснаваць па 60 маёнткаў у 7 заходніх губернях (без Віцебскай і Магілёўскай губерняў). Таксама свой план па стварэнні маяратаў прадставіў і віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркавіч. Ён у траўні–чэрвені 1845 г. падаў дзве запіскі імператару, дзе прапаноўваў наступнае: «Калі б гэтыя маёнткі маглі перайсці ў валоданне Рускага праваслаўнага дваранства, на якіх бы то не было падставах, г. зн. часткай пасродкам продажу, часткай дароўна ад манархавых шчадротаў, у спадчыннае валоданне маяратамі, пажыццёвымі ўладаннямі або на эмфеметычных правілах (падобна таму, як існавала пры каралях Польскіх) або наўзамен пенсій, якія выплочваюцца з дзяржаўнага казначэйства і ад Камітэта 18 жніўня 1814 года, з тым, каб неслужбоўцы былі абавязаны абавязкова жыць самі ў маёнтках, а служачыя кіраваць Рускімі паверанымі, з прадастаўленнем тым і іншым агульных правоў па выбарах дваранства і з абавязаннем іх абавязкова ўвесці карэннае Рускае дваровае кіраванне» [5, с. 428]. П. Д. Кісялёў раскрытыкаваў праекты А. В. Сямёнава і Ф. Я. Мірковіча. Ён настойваў на тым, каб канфіскаваныя маёнткі пакінуць у дзяржаўнай вёсцы, а маяраты ствараць шляхам куплі памешчыцкіх маёнткаў за кошт арэндных даходаў. Затым быў загад Мікалая І ад 23 чэрвеня 1846 г., па якім усе канфіскаваныя маёнткі перадаваліся Міністэрству дзяржаўных маёмасцяў. Падводзячы высновы можна сказаць, што пасля 1846 г. на тэрыторыі Беларусі не быў створаны ні адзін маярат, праект па стварэнні маяратаў праваліўся.

Падводзячы вынікі можна сказаць, што да стварэння Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў самым актуальным пытаннем на пасяджэннях Камітэта заходніх губерняў было пытанне аб кіраванні дзяржаўнымі сялянамі ў канфіскаваных маёнтках. Члены Камітэта спрабавалі не дапусціць мясцовых памешчыкаў да кіравання ў гэтых уладаннях і прыцягнуць сюды

рускіх дваран. Таму прымалася некалькі праектаў, сярод якіх можна адзначыць: аддача канфіскаваных маёнткаў у вотчыннае валоданне на асаблівых правах 250 рускім чыноўнікам; перадача ўладанняў рускім памешчыкам у безсправаздачную адміністрацыю на 12 гадоў пры даплаце 30 % з даходаў маёнтка; стварэнне маяратаў. Але рэальных зменаў гэтыя праекты не прынеслі ў сістэму землеўпарадкавання. У большасці канфіскаваных уладаннях мясцовае дваранства працягвала быць арандатарамі і выконваць функцыі адміністратараў.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Дружинин, П. М.* Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселёва: в 2 т. / П. М. Дружинин. – М-Л. : Изд-во АН СССР, 1946–1958. – Т. 1: Предпосылки и сущность реформы. – 1946. – 635 с.; Т. 2: Реализация и последствия реформы. – 1958. – 617 с.
2. Журналы Комитета Западных губерний / изд. подгот. Т. В. Андреева, И. Н. Вибе, Б. П. Миловидов, Д. Н. Шилов – Т. 1 : 1831–1835 гг. – СПб. : ДМИТРИЙ БУЛАНИН, 2017. – 848 с.
3. Журналы Комитета Западных губерний / изд. подгот. Т. В. Андреева, И. Н. Вибе, Б. П. Миловидов, Д. Н. Шилов – Т. 2 : 1836–1840 гг. – СПб. : ДМИТРИЙ БУЛАНИН, 2021. – 800 с.
4. *Лепеш, О. В.* Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831–1848 гг.) / О. В. Лепеш. – Минск : РИВШ, 2010. – 158 с.
5. *Миркович, Ф. Я.* Из записок Ф. Я. Мирковича / Ф. Я. Миркович // Русский архив. – 1890. – №3. – С. 395–434.